системы образования, просвещения, подготовки кадров. Важным звеном данной системы является экологическое образование и воспитание детей в дошкольном возрасте.

По результатам проведённых природоведческих акций и эмпирической работы можно сделать следующие выводы:

– суть формирования бережного отношения к природным ресурсам у детей старшего дошкольного возраста заключается в оказании добрых дел и поступков в реальной экологической деятельности;

– в ходе природоведческих акций дошкольники должны получать не только природоведческие знания, они должны учиться навыкам экологической культуры в реальной жизни.

**Список цитируемых источников**


1. *Бобылёва, Л.* О программе экологического воспитания старших дошкольников / Л. Бобылёва, О. Дупленко // Дошкольное воспитание. — 2005. — № 7. — С. 36—42.
2. *Кашлев, С. С.* Педагогическая диагностика в процессе экологического образования: сущность и методика проведения / С. С. Кашлев // Социально-экологические технологии. — 2012. — № 2. — С. 126—134.
3. *Екимова, В. В.* Воспитание бережного отношения к природе у детей дошкольного возраста / В. В. Екимова. — СПб. : Реноме, 2012. — 326 с.



УДК 37.016:821.161.3*01/03(04)



**В. М. Савеня**

*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*


# МЕТАДЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫІ ЎРОКАЎ ПАЗАКЛАСНАГА ЧЫТАННЯ Ў ПАЧАТКОВАЙ ШКОЛЕ

**Уводзіны.** Пазакласнае чытанне — мэтанакіраванае самастойнае чытанне вучнямі мастацкай, навукова-пазнавальнай і іншай літаратуры; неабходнае звяно вучэбнага працэсу і важны сродак маральнага і эстэтычнага выхавання малодшых школьнікаў.

Галоўная мэта ўрокаў пазакласнага чытання — сфарміраваць у малодшых школьнікаў веды пра дзіцячыя кнігі з даступнага кола чытання і асобасную, адпаведную ўзроставым магчымасцям і індывідуальным асаблівасцям дзіцяці выбарчую цікавасць да кніг, жаданне і ўменне іх свядома выбіраць і асэнсавана чытаць.

У навучальных установах Беларусі «асаблівая ўвага павінна надавацца ўрокам пазакласнага чытання. Да такой педагагічнай дзейнасці трэба ставіцца як да актыўнага сродку патрыятычнага і інтэрнацыянальнага выхавання, як да сродку, які дае магчымасць паказаць ролю літаратуры ў жыцці грамадства і далучае да духоўных скарбаў свайго народа, што дапамагае зацікавіць літаратаурай не толькі як адметнай лінгвістычнай з’явай, але і як навучальным прадметам» [1].

**Асноўная частка.** Урокі пазакласнага чытання з’яўляюцца важным звяном у сістэме педагагічнага кіраўніцтва самастойным чытаннем дзяцей. Яны займаюць пэўную частку ў сістэме навучання, маюць сваю спецыфіку і пэўныя адрозненні ад урокаў класнага чытання.

Аналіз літаратурных крыніц і педагагічнага вопыту настаўнікаў пачатковых класаў паказаў, што ўрокі пазакласнага чытання маюць наступныя асаблівасці:

1. Адрозніваюцца ад урокаў класнага чытання, таму што на іх вырашаюцца іншыя задачы.

2. Структура ўрокаў залежыць ад мэты заняткаў і ад матэрыялу, які складае змест урока. З аднаго боку — гэта свабодныя ўрокі, на якіх развіваецца чытацкі інтарэс вучняў, з другога боку — гэта ўрокі, прадугледжаныя праграмай, на якіх фарміруюцца пэўныя ўменні і навыкі.

3. На кожным уроку ёсць элементы аналізу твора ў форме гутаркі або вольных выказванняў дзяцей. Выдзяляецца галоўная думка твора: «Што вы можаце сказаць пра гэтую кнігу?», «Што вам спадабалася?».

4. На такіх уроках дзеці часта чытаюць услых, праводзіцца чытанне па ролях, інсцэніраванне, чытанне на памяць. Слоўнікавая работа адрозніваецца тым, што тлумачацца не ўсе незразумелыя словы, а толькі найбольш цяжкія, аналізуюцца найбольш яркія вобразы. Дзеці вучацца самастойна карыстацца рознымі слоўнікамі, спасылкамі, даведнікамі. Вучні сцісла пераказваюць сюжэт, расказваюць, што спадабалася.

5. На ўроках пазакласнага чытання ствараюцца ўмовы для творчых відаў работы вучняў: ілюстраванне прачытанага, лепка, аплікацыя, водгукі.

6. На ўроку пазакласнага чытання павінна быць самастойная работа, 4—5 выступленняў вучняў аб прачытаным, элементы займальнасці (конкурсы, віктарыны, загадкі, прыказкі). Гутарка праводзіцца на больш высокім узроўні, не дапускаюцца дробязныя пытанні. Пытанні патрабуюць разгорнутых адказаў. Высвятляецца галоўная думка, сюжэт, прычына-выніковыя сувязі.

7. На ўроках пазакласнага чытання рэкамендуюцца новыя кнігі. Прыёмы рэкамендацыі і заахвочвання да чытання розныя: выстаўка кніг; чытанне ўрыўкаў з новых кніг; дзеці расказваюць, якія кнігі яны чыталі самі, робяць малюнкі да прачытаных твораў [2].


© Савеня В. М., 2022





Репозиторий БарГУ

Пры падрыхтоўцы да ўрокаў пазакласнага чытання настаўніку варта забяспечваць паслядоўнасць і сістэматычнасць у засваенні вучнямі ведаў, выпрацоўцы ўменняў і навыкаў. Кожны ўрок пазакласнага чытання павінен развіваць чытацкую самастойнасць, актыўнасць, таму і структура іх павінна быць разнастайная. Структурныя кампаненты ўрокаў пазакласнага чытання умоўныя, могуць змяняцца ў залежнасці ад этапу навучання, тэматыкі заняткаў і ад форм работы, выбраннай настаўнікам. У структуры традыцыйнага ўрока пазакласнага чытання метадыстамі выдзелена некалькі фрагментаў: работа з выставай прачытаных кніг (3–5 хвілін), усебаковы аналіз вылучаных кніг (20—25 хвілін), знаёмства з новымі творамі, жанрамі, тэмамі чытання і пісьменнікамі (15—20 хвілін), дамашняе заданне (2—3 хвіліны).

Важную ролю ў прыцягненні вучняў да чытання маюць нетрадыцыйныя ўрокі. Канкрэтнай структуры нетрадыцыйных урокаў пазакласнага чытання не існуе, таму што кожны ўрок — гэта творчасць настаўніка. Найбольш пашыранымі формамі нетрадыцыйных урокаў пазакласнага чытання з'яўляюцца: урок-казка, урок-дыспут, урок-падарожжа і інш.

Такім чынам, традыцыйныя ўрокі пазакласнага чытання не маюць пэўнай структуры, могуць праводзіцца ў разнастайных формах. Кожны ўрок з'яўляецца паказчыкам творчасці настаўніка. Найбольшую цікавасць у вучняў выклікаюць менавіта нетрадыцыйныя ўрокі, на якіх вучні вучацца разважаць, выконваць заданні творчага характару.

Пры выкананні заданняў творчага характару ў вучняў развіваецца мысленне, уменне працаваць самастойна ці групамі. Структура такіх урокаў таксама не вытрымана, можа змяняцца.

Намі было арганізавана даследаванне метадычных асаблівасцей арганізацыі і правядзення настаўнікамі розных форм урокаў пазакласнага чытання ў пачатковых класах. Даследаванне праводзілася на базе ДУА «Сярэдняя школа № 19 г. Баранавічы» і ДУА «Будчанскі я/с-СШ». У даследаванні прымалі ўдзел 15 настаўнікаў пачатковых класаў.

Даследаванне праводзілася ў форме анкетавання, для гэтага была спецыяльна распрацавана анкета для настаўнікаў. Анкета ўключала пытанні з мэтай выявіць стаўленне настаўнікаў да выкарыстання розных форм арганізацыі і правядзення ўрокаў пазакласнага чытаня ў адукацыйным працэсе пачатковай школы. Па выніках аналізу адказаў настаўнікаў пачатковых класаў на пытанні анкеты можна зрабіць наступныя высновы.

Пры адказе на пытанне анкеты № 1 «Ці лічыце Вы эфектыўным правядзенне разнастайных форм працы на ўроках пазакласнага чытання ў пачатковых класах?» 100 % настаўнікаў далі станоўчы адказ.

Пры адказе на пытанне анкеты № 2 «Ці выкарыстоўваеце Вы віктарыны на ўроках пазакласнага чытання ў пачатковых класах?» адказы настаўнікаў размеркаваліся наступным чынам: 13 (86,6 %) настаўнікаў выкарыстоўваюць віктарыны на ўроках пазакласнага чытання ў пачатковых класах па неабходнасці, 2 (13,4 %) — выкарыстоўваюць часта.

У ходзе адказу на пытанне анкеты № 3 «На якіх этапах урока ў пачатковай школе, на Вашу думку, мэтазгодней за ўсё выкарыстоўваць крыжаванкі?» 6 (40 %) настаўнікаў адзначылі, што выкарыстоўваць крыжаванкі мэтазгодней на этапе актуалізацыі ведаў, 4 (26,6 %) — на этапе замацавання, 5 (33,4 %) настаўнікаў — на этапе актуалізацыі і этапе замацавання ведаў.

У ходзе адказу на пытанне анкеты № 4 «Ці лічыце Вы эфектыўным выкарыстанне нетрадыцыйных форм арганізацыі ўрокаў пазакласнага чытання ў пачатковай школе?» 100 % настаўнікаў далі станоўчы адказ.

Пры адказе на пытанне № 5 анкеты «Пералічыце формы арганізацыі ўрокаў пазакласнага чытання, якімі Вы часцей за ўсё карыстаецеся ў сваёй педагагічнай дзейнасці» найбольш распаўсюджанымі адказамі настаўнікаў сталі наступныя: урок-падарожжа, урок-віктарына, таксама настаўнікі згадалі такія формы арганізацыі ўрокаў пазакласнага чытання, як урок-казка, урок-загадка.

У ходзе адказу на пытанне анкеты № 6 «Якімі асноўнымі прынцыпамі Вы кіруецеся пры арганізацыі ўрокаў пазакласнага чытання ў пачатковых класах?» большасць настаўнікаў адзначылі, што вельмі важным пры арганізацыі ўрокаў пазакласнага чытання з'яўляецца ўлік асаблівасцей пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў.

Так, у адпаведнасці з гэтымі аспектамі выбіраюцца даступныя і пасільныя навучэнцам заданні, пры гэтым, заданні павінны мець як праблемны, так і творчы характар і актывізаваць пазнавальную актыўнасць, здольнасць аналізаваць і ўсталёўваць прычынна-выніковыя сувязі.

Таксама ў ходзе аналізу адказаў настаўнікаў на дадзенае пытанне было выяўлена, што настаўнікі лічаць важным аспектам пры арганізацыі ўрокаў пазакласнага чытання прытрымлівацца прынцыпу даступнасці, выкарыстоўваць разнастайныя формы працы на ўроках пазакласнага чытання, праводзіць урокі ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай.

Пры адказе на пытанне анкеты № 7 «Як ставяцца вучні пачатковых класаў да правядзення настаўнікамі ўрокаў пазакласнага чытання ў разнастайных формах (па Вашых назіраннях)?» адказы настаўнікаў пачатковых класаў размеркаваліся наступным чынам: 11 (73,3 %) настаўнікаў адзначылі станоўчае стаўленне вучняў пачатковых класаў да разнастайных форм арганізацыі ўрокаў пазакласнага чытання, 4 (26,7 %) — нейтральнае.

На пытанне анкеты № 8 «Ці ўлічваеце Вы накіраванасць пазнавальнай цікавасці навучэнцаў пры выбары форм і зместу ўрокаў пазакласнага чытання ў пачатковай школе?» 100 % настаўнікаў далі станоўчы адказ.

Пры адказе на пытанне анкеты № 9 «Як Вы лічыце, ці спрыяе сістэмнае выкарыстанне розных форм урокаў пазакласнага чытання развіццю чытацкага інтарэсу і паглыбленню ведаў навучэнцаў па літаратурным чытанні?» 100 % настаўнікаў далі станоўчы адказ.

Пры адказе на пытанне анкеты № 10 «Якіх вынікаў Вы хочаце дасягнуць пры арганізацыі і правядзенні разнастайных форм урокаў, выкарыстоўваючы розныя формы працы на ўроках пазакласнага чытання ў пачатковых



Рэпазіторый БарДУ

класах?» большасць настаўнікаў адзначылі наступнае: развіццё і фарміраване чытацкай актыўнасці навучэнцаў, фарміраванне станоўчай матывацыі чытання, фарміраванне цікавасці навучэнцаў да ўрокаў пазакласнага чытання і да самастойнага чытання мастацкіх твораў на розную тэматыку, пашырэнне слоўніка і інш.

Такім чынам, па выніках анкетавання настаўнікаў пачатковых класаў можна зрабіць выснову аб тым, што настаўнікі разумеюць значэнне арганізацыі розных форм урокаў пазакласнага чытання, станоўча ставяцца да выкарыстання разнастайных форм працы на ўроках пазакласнага чытання ў пачатковай школе.

На аснове праведзенай работы намі былі распрацаваны метадычныя рэкамендацыі настаўнікам па правядзенні ўрокаў пазакласнага чытання ў пачатковых класах:

1. Урок пазакласнага чытання павінен быць цікавым, сучасным, займальным, нестандартным, добра, калі будуць прысутнічаць пісьменнікі і кампазітары.

2. Пры падрыхтоўцы да ўрокаў пазакласнага чытання неабходна ўлічваць індывідуальныя магчымасці навучэнцаў, выбіраць пасільныя заданні як творчага, так і праблемнага характару. Рэкамендуецца прапаноўваць разнастайныя формы працы ў адпаведнасці з сучаснымі тэндэнцыямі.

3. Мэтазгодна сістэматычна знаёміць школьнікаў з даступнай для самастойнага чытання літаратурай і яе відамі, вучыць арыентавацца ў кнізе і сярод кніг, свядома выбіраць для сябе патрэбныя, даступныя разуменню кнігі, развіваць у дзяцей з дапамогай самастойнага чытання жаданне і ўменне вучыцца.

4. Вядучая роля на ўроку павінна належыць дзецям. Дзеці прыносяць прачытаныя кнігі ў клас і самастойна фарміруюць з іх выставу, дзеляцца адно з адным уражаннямі ад прачытанага, пашыраюць свой кругагляд. Настаўнік павінен загадзя паклапаціцца аб стварэнні сваім вучням спрыяльных умоў для чытацкай дзейнасці. А гэта значыць, што адукацыйная задача будучага ўрока павінна быць сфармулявана яскрава і дакладна.

**Заключэнне.** Такім чынам, можна сказаць, што пры сістэмным выкарыстанні розных форм урокаў пазакласнага чытання паглыбляюцца веды па літаратурным чытанні ў пачатковай школе, у навучэнцаў фарміруецца чытацкі інтарэс. Урокі пазакласнага чытання спрыяюць пашырэнню чытацкага кругагаляду вучняў, фарміраванню ўменняў працаваць з кнігамі, свабодна арыентавацца ў свеце дзіцячых кніг беларускіх пісьменнікаў, выхоўваюць патрэбу ў самастойным чытанні вучнямі кніг, прывіваюць любоў да кніг і чытання ўвогуле.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. *Мельнік, Н. В.* Урокі пазакласнага чытання. 3—4 класы : дапам. для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рус. мовай навучання / Н. В. Мельнік. — 4-е выд, выпр. і дап. — Мазыр : Белы Вецер, 2015. — 62, [2] с.

2. *Львов, М. Р.* Методика преподавания русского языка в начальных классах : учеб. пособие для студ. высш. пед. учеб. заведений / М. Р. Львов, В. Г. Горецкий, О. В. Сосновская. — 3-е изд. — М. : [б. и.], 2007.

3. *Светловская, Н. Н.* Методика внеклассного чтения : кн. для учителя / Н. Н. Светловская. — 2-е изд., перераб. — М. : Просвещение, 1991. — 207 с.


УДК 373.2

**А. А. Савчук**

*Учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь*

# РАЗВИТИЕ НАВЫКОВ ВЫРАЗИТЕЛЬНОСТИ И ОБРАЗНОСТИ РЕЧИ У ДЕТЕЙ СТАРШЕГО ДОШКОЛЬНОГО ВОЗРАСТА

**Введение**. Развитие связной речи ребёнка является важнейшим условием его полноценного речевого и общего психического развития, поскольку язык и речь выполняют психическую функцию в развитии мышления и речевого общения, в планировании и организации деятельности ребёнка, самоорганизации поведения, в формировании социальных связей. Язык и речь — это основное средство проявления важнейших психических процессов памяти, восприятия, мышления, а также развития других сфер: коммуникативной и эмоционально-волевой.

**Основная часть.** Одна из характеристик связной речи — образность. Образная речь — сложное, многогранное понятие. Ребёнок дошкольного возраста способен овладеть умением использовать в своей речи образные средства и выражения, адекватно подбирать средства выразительности в связной речи. Усвоение образных средств языка развивает у ребёнка самостоятельность в речевой деятельности, интерес к языку, внимание к культурному богатству народа [1].

Особенности развития мыслительных процессов в старшем дошкольном возрасте позволяют ребёнку замечать образные выражения и понимать некоторые из них, но, вместе с тем, без помощи взрослого ребёнок не может полностью овладеть значением образных средств языка.

Практика показывает, что речь детей небогата образными средствами, почерпнутыми из литературных источников, но часто в речи встречаются просторечные слова и выражения, услышанные от взрослых и старших

© Савчук А. А., 2022

Репозиторий БарГУ